**УДК [94(476) + 94(438) + 323.22/28 (438)(091)] „1733/1735"**

# ШЛЯХТА ЎСХОДНІХ ВАЯВОДСТВАЎ ВКЛ І РАСІЙСКІЯ ВОЙСКІ ПАДЧАС "ВАЙНЫ ЗА ПОЛЬСКУЮ СПАДЧЫНУ 1733–1735 гг."

***канд. гіст. навук А.У. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуюцца ўзаемадачыненні шляхты ўсходніх ваяводстваў ВКЛ (Аршанскага павета, Віцебскага, Полацкага і Мсціслаўскага ваяводстваў) з расійскімі войскамі, якія былі ўведзены з мэтай змагання з прыхільнікамі Станіслава І Ляшчынскага і падтрымкі мясцовых прыхільнікаў Аўгуста ІІІ. Заўважана, што на баку Станіслава І Ляшчынскага ў сваёй большасці выказалася шляхта Аршанскага павета і Полацкага ваяводства. Супраць іх і былі накіраваны дзеяннні расійскіх войск з корпуса Юрыя Рапніна. Гэтыя расійскія войскі сталі прычынай, што на баку Аўгуста ІІІ выказалася віцебская шляхта. Выяўлена, што пры падтрымцы расійскіх войскаў перавагу ў Мсціслаўскім ваяводстве таксама атрымалі прыхільнікі Аўгуста ІІІ. Удалося ўстанавіць, што перамогі расійскіх войскаў над прыхільнікамі Ляшчынскага з Полацкага ваяводства і Аршанскага павета, прымусілі мясцовую шляхту да канца 1734 г. прызнаць уладу Аўгуста ІІІ.*

***Ключавыя словы***: *шляхта, расійскія войскі, корпус Ю. Рапніна, Станіслаў І Ляшчынскі, Аугуст ІІІ, усходнія ваяводствы.*

**Уводзіны**. Абранне каралём 13 верасня 1733 г. Станіслава І Ляшчынскага не было прызнана часткай шляхты Рэчы Паспалітай, якая 5 кастрычніка 1733 г. пры падтрымцы расійскіх войскай абрала каралём пад імём Аўгуста ІІІ саксонскага курфюрста Фрыдэрыка Аўгуста. Сярод праціўнікаў Станіслава І Ляшчынскага і выбаршчыкаў Аўгуста ІІІ большасць прадстаўляла ВКЛ. З усходніх ваяводстваў ВКЛ гэта была нязначная частка шляхты, якая ў асноўным прадстаўляла Мсціслаўскае і Полацкае ваяводствы. Шляхта іншых усходніх ваяводстваў, а таксама і большасць полацкай і мсціслаўскай шляхты, выказаліся на элекцыйным сойме ў падтрымку Станіслава І Ляшчынскага. Зразумела, што ў такім выпадку былі слабыя спадзяванні аб падтрымцы Аўгуста ІІІ шляхтай усходніх ваяводстваў ВКЛ. Для ўзмацнення іх пазіцый у гэтых ваяводствах і для змагання з прыхільнікамі Станіслава І Ляшчынскага было вырашана ўвесці спецыяльны корпус расійскіх войскаў.

Узаемадзеянні расійскіх войскаў і шляхты ВКЛ ужо былі ў цэнтры ўвагі даследчыкаў [1–7]. Праўда большасць гэтых даследаванняў датычылася ці ўсёй Рэчы Паспалітай ці ўсёй тэрыторыі ВКЛ. Пры такім падыходзе, узаемадзеянні шляхты ўсходніх паветаў ВКЛ і расійскіх войскаў толькі ўпаміналіся ў некаторых з вышэйзгаданых даследаваннях. Актуальнасць артыкула заключаецца ў тым, што нашай мэтай будзе даследваць узаемаадносіны шляхты ўсходніх ваяводстваў Вялікага Княства Літоўскага з расійскімі войскамі падчас "вайны за польскую спадчыну 1733–1735 гг."

**Асноўная частка**. Расійскія войскі ў выглядзе корпуса князя Юрыя Рапніна ўвайшлі ў ВКЛ размясціліся на ўсходзе ВКЛ 12 лістапада 1733 г. каля мястэчка Якавічы. Гэты корпус складаўся з 3 пяхотных батальонаў, колькасцю 1670 жаўнераў [3, р. 314]. Згодна загаду расійскага ўрада Юрый Рапнін размясціў свой корпус у Віцебску. З яго быў вылучаны атрад пад кіраўніцтвам прэм'ер-майора Аленіна, які быў накіраваны ў Быхаў [8, с. 588; 9, л. 8, 12]. Якавічы, са слоў Рапніна, належылі рагачоўскаму старосце Міхалу Пацею, а былі ў заставе ў віцебскага падкаморыя Казіміра Саковіча, які адразу прыехаў і заявіў аб сваёй поўнай падтрымцы Аўгуста ІІІ і Генеральнай Варшаўскай канфедэрацыі [8, с. 588; 9, л. 8]. Ужо 18 лістапада 1733 г. з дэкларацыямі падтрымкі Аўгуста ІІІ і Генеральнай Варшаўскай канфедэрацыі да Рапніна прыбылі віцебскія ўраднікі: стольнік і гродскі пісар Павал Багамолец, гараднічы Юзаф Лускіна, земскі пісар Казімір Гурко, гродскі суддзя Антоній Жаба. Менавіта тады Рапнін з задавальненнем паведаміў у Пецярбург, што «противной партии и хоронгв неслышно и в оном городе замешания никакого ныне не имеется» [9, л. 9]. Аднак пазней, больш дакладна разведаўшы сітуацыю, Рапнін заўважыў, што прыхільнікам Ляшчынскага з'ўляецца віцебскі ваявода Марцін Агінскі, які невядома дзе знаходзіцца, а таксама ў Аршанскім павеце «имеется шляхества, которые к росийской стороне не склонны ж и подписались Станиславу». Адначасова шляхта Віцебскага вяводства прыязджала і прыносіла прысягу Аўгусту ІІІ. Рапнін таксама пытаўся аб дазволе выдаваць шляхце ахоўныя граматы на абарону ўладанняў ад пастояў войскаў і выбару правіянта. Калі ахоўныя дакументы трэба было выдаваць, то Рапніна цікавіла, з якіх уладанняў яму ўзяць прадукты і фураж для забеспячэння свайго корпуса. Сама шляхта была зацікаўлена ў такіх дакументах і прасіла аб іх выдачы [9, л. 17–17об].

Рапнін дакладна ацаніў сітуацыю аб непрыхільнасці аршанскай шляхты. Нажаль нам невядома, калі аршанская шляхта стварыла канфедэрацыю ў падтрымку Станіслава І Ляшчынскага. Аднак ужо 14 студзеня 1734 г. на сваім кангрэсе полацкая шляхта выказалася ў падтрымку Станіслава І Ляшчынскага і

абрала сваіх паслоў да аршанскай шляхты. Праз іх полацкая шляхта дзякавала аршанскай за стварэнне імі канфедэрацыі ў абарону выбара Станіслава Ляшчынскага [10, арк.1адв]. З гэтага можна зрабіць выснову, што аршанская канфедэрацыя прыхільнікаў Ляшчынскага, нягледзячы на прысутнасць расійскіх войскаў, была створана ў канцы 1733 г. За ёй 11 студзеня 1734 г. у падтрымку Ляшчынскага выказалася і полацкая шляхта. Такім чынам, ужо на пачатак 1734 г. шляхта Полацкага ваяводства і Аршанскага павета выказалася ў падтрымку Станіслава I Ляшчынскага.

Кіраўніком расійскіх войскаў у Княстве быў прызначаны Леў Ізмайлаў, які са сваім корпусам хацеў дзейнічаць каля Вільні. Менавіта яму павінен быў падначальвацца і Юрый Рапнін са сваім корпусам. Аднак часцей Юрый Рапнін, які знаходзіўся ў Віцебску, атрымліваў загады непасрэдна з Пецярбурга: «смотреть и разведывать накрепко о состоянии всех тамошних обывателей особливо о шляхетстве» [9, л. 8, 12]. 25 лістапада 1733 г. Рапнін даведаўся ад віцебскага гараднічага Юзафа Лускіны, што на элекцыйным сойме Рэчы Паспалітай ад Віцебскага ваяводства прысутнічалі і выбіралі каралём Станіслава I Ляшчынскага: віцебскі гродскі суддзя Антоній Жаба, віцебскі земскі пісар Казімір Гурко, віцебскі стольнік і віцебскі гродскі пісар Павал Багамолец. Той жа Лускіна паведаміў, што яны нават атрымалі «од Станислава Лещинского денги для набирания хоругв» [9, л. 13]. Праўда абвінавачаныя шлях-ціцы не прадпрымалі ніякіх крокаў для арганізацыі руху ў падтрымку Станіслава I Ляшчынскага. Рабілі гэта іншыя. Ужо 5 снежня 1733 г. у Рапніна з'явілася інфармацыя, што ў Пажэнках і Беліцы ў шляхцічаў Навацкага і Крыштафа Статкевіча, «которые к росийской стороне не склонны», меліся з'езды шляхты і знаходзіліся ўзброенныя харугвы. Пажэнкі знаходзіліся ўсяго ў 10 мілях ад Віцебска, а Беліца – 13 мілях. Рапнін накіраваў туды роту валагодскага палка «с надлежащим числом обер и ундер афицеров». Гэты атрад нікога не знайшоў, але даведаўся, што Статкевіч разам з аршанскім старостай Юзафовічам і іншымі шляхціцамі на элекцыйным сойме атрымалі 2200 чэрвоных злотых на стварэнне чатырох харугваў па 100 чалавек кожная. З гэтай сумы Статкевіч атрымаў на фарміраванне адной харугвы 190 чэрвоных злотых. Менавіта ў Пажэнках 5 снежня 1733 г. адбыўся з'езд шляхты Аршанскага павета, дзе прысутнічалі аршанскі гродскі староста Юзафовіч з сваёй харугвай, ротмістр Перуці з харугвай, ротмістр Міхал Навацкі з харугвай, ротмістр Вінцэнт Ларскі з харугвай. Сам Статкевіч меў 24 жаўнераў і 10 нанятых за грошы на службу шляхціцаў. Акрая таго, на з'ездзе прысутнічалі шляхціцы Булгакі, якія таксама былі на элекцыйным сойме і атрымалі ад Ляшчынскага грошы на фарміраванне харугваў, але яшчэ не паспелі гэта зрабіць. Ужо 6 снежня 1733 г. гэтыя прыхільнікі Ляшчынскага накіраваліся ў Оршу. Сам Статкевіч выехаў 7 снежня 1733 г. Пазней у гэты самы дзень, 7 снежня 1733 г., у Пажэнкі ад Юзафовіча прыбыў атрад пад кіраўніцтвам ротмістра Завішы колькасцю «80 товарищей и 240 пахолков и хлопцев», які меў аб'яднацца з атрадам Статкевіча і разам напасці на расійскія войскі. Аднак, не знайшоўшы Статкевіча, гэты атрад Завішы вярнуўся ў Оршу. Адначасова ў Беліцы расійскія войскі не знайшлі ніякіх прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага. Уладальнік Беліцы Ігнат Навацкі пераконваў, што яго сын Міхал не з'яўляецца прыхільнікам Ляшчынскага. У доказ Навацкі паказваў ахоўны дакумент для сына ад генерал-ад'ютанта Арцемія Валынскага. Больш таго, Ігнат Навацкі сцвярджаў, што харугва яго сыну патрэбна толькі для абароны на каптуровых судах, якія мелі зараз адбывацца ў Оршы. Безумоўна гэта быў падман. Ды і Рапнін асабліва не давяраў гэтай інфармацыі і 14 снежня 1733 г. накіраваў новы, больш моцны атрад супраць прыхільнікаў Ляшчынскага ў Аршанскім павеце [9, л. 18–19].

16 снежня 1733 г. з Оршы Рапніну напісаў Юзафовіч. Увесь ліст Юзафовіча меў мэтай пераканаць Рапніна ў прыязненым стаўленні аршанскага гродскага старосты да расійскіх войскаў. Юзафовіч паведаміў, што вярнуўшыся на ўсход ВКЛ адразу хацеў прыехаць да Рапніна і выказаць яму сваю прыхільнасць, але яго затрымалі пільныя справы. Юзафовіч інфармаваў, што ўдзельнічаў у выбары каралём Станіслава I Ляшчынскага, але ня ведаў, што такія неабдуманыя дзеянні выклікаюць уваход расійскіх войскаў у Рэч Паспалітую. Юзафовіч дзякаваў за прапанаванае прабачэнне за падобную дзейнасць і абяцаў прыехаць, як даробіць свае справы ў Аршанскім павеце [9, л. 24]. Ужо 19 снежня 1733 г. Юзафовіч напісаў Рапніну новы ліст. У ім Юзафовіч заявіў аб прыязным стаўленні да Расіі ўсёй шляхты Аршанскага павета і абяцаў расійскай царыцы «указы готовы полнить всем поветом» [8, с. 621]. Рапнін нявельмі давяраў заявам Юзафовіча і паведамляў, што: «на которое его письмо писано к нему от меня, чтоб виделся со мною в Витебске, однако же не утверждаюсь на том его письме, сего же декабря 11 (22 декабря по н.с.) дня командировал в Оршу капитана Шмакова и 150 человек солдат и Рославльского эскадрона драгун 30 человек с надлежащим числом обер и унтер-офицеров, для подлиннаго разведывания о собрании противных партий и хорунг и ужели у показаннаго Иезофовича и у прочих, о которых доносил прежде сего в Кабинет Ея И. В-ва явятся в собрании оныя хорунги, то по силе данной мне инструкции, приказал оных прекращать, и сначала разганять и буде же будут противиться, с такими поступать неприятельски» [8, с. 621; 11, л. 21об]. Юзафовіч працягваў сваю гульню з Рапніным і 23 снежня 1733 г. напісаў яму новы ліст. У ім Юзафовіч сцвярджаў, што павятовыя ротмістры «в ужасе от страха» зыйшлі з сваіх уладанняў з-за шкодаў расійскіх войскаў і «до того времени по лесах прятавшиеся» да яго далучыліся. Юзафовіч ня

верыў, што расійскія войскі так дзейнічалі па загаду Рапніна «против заприсяженным союзам и приятельским между народом трактатам». На думку Юзафовіча, гэты былі не рэгулярныя расійскія войскі, а самавольна сабраныя атрады расійскіх жаўнераў ад якіх для «безопасности собственного здоровья» ротмістры схаваліся пад абаронай аршанскага гродскага старосты, як «полковника и поветового господаря» [9, л. 39–39об]. Такім спосабам Юзафовіч цягнуў час і далучаў да свайго атрада ўсё новыя сілы прыхільнікаў Станіслава Ляшчынскага. Рапнін не давяраў такім сцвярджэнням Юзафовіча, але ня здолеў перашкодзіць аб'яднацца пад яго кіраўніцтвам прыхільнікам Ляшчынскага.

Тым часам 8 снежня 1733 г. дасланы Рапніным Аленін паспяхова заняў Быхаў [8, с. 620; 9, л. 30]. Аленін, таксама, не давяраў заявам Юзафовіча. Больш таго, даведаўшыся, што аршанскі гродскі староста Юзафовіч з сваімі прыхільнікамі мае быць у Магілёве, даслаў туды 10 снежня 1733 г. з Быхава атрад колькасцю 60 жаўнераў пад кіраўніцтвам паручыка Таўстога [9, л. 20]. Аленіну прыйшлося вырашаць і іншую праблему, якая была ваклікана з'яўленнем прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага і ў Рэчыцкім павеце. Да Аленіна звярнуўся адміністратар прапойскага староства (уладальнікам быў адзін з лідараў прыхільнікаў Аўгуста ІІІ у ВКЛ Багуслаў Незабытоўскі) Антоній Конча, які меў ахоўны ліст ад расійскага пасла ў Рэчы Паспалітай Карла Густава Левенвольдэ. Конча інфармаваў Аленіна, што каля Прапойска сабраўся атрад прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага. Супраць іх Аленін 16 снежня 1733 г. даслаў атрад з 20 жаўнераў на чале з падпаручыкам [9, л. 30].

Цалкам згодна расійскім планам склалася сітуацыя ў Віцебскім ваяводстве. Віцебскі падкаморы Казімір Саковіч сваім універсалам склікаў соймік на 25 студзеня 1734 г. Згодна Саковічу, соймік быў ім скліканы на падставе ўніверсала маршалка Генеральнай Варшаўскай канфедэрацыі Панінскага, але гэты ўніверсал не дайшоў да Віцебскага ваяводства. Другой падставай склікання сойміка быў універсал Расійскага генерала Льва Ізмайлава ад 30 снежня 1733 г., які аказаўся ў Віцебскім ваяводстве 11 студзеня 1734 г. [11, л. 7] У выніку 25 студзеня 1734 г. у Віцебску адбыўся соймік, на якім віцебская шляхта далучылася да Генеральнай Варшаўскай канфедэрацыі, і Аўгусту ІІІ «в верности присягу учинили и поклялись как шляхетство, так и мещане и послов на коронацию до Кракова отправили» [11, л. 21]. Рапнін цалкам не давяраў віцебскай шляхце і прымусіў віцебскага гродскага рэгента Аляксандра Тышу Быкоўскага і віцебскага гродскага намесніка Дамініка Юзафа Русецкага скласці спіс уласнікаў уладанняў у Віцебскім ваяводстве, якія не былі на сойміку і таму не прысягнулі Аўгусту ІІІ. Згодна гэтага спісу, з-за хваробаў не былі на сойміку: віцебскі падваявода Рэмігіян Сяліцкі, віцебскі земскі суддзя Ігнат Навацкі, віцебскі стольнік і віцебскі гродскі пісар Павал Багамолец. Яшчэ некаторыя шляхціцы, як полацкі стольнік Юзаф Пакаш, мінскі стольнік Лявон Валадковіч, віленскі чашнік Мікалай Петрусевіч, Пжысецкі і нават падскарбі ВКЛ Ян Салагуб, звычайна не бывалі на віцебскіх сойміках, бо мелі ўладанні ў іншых паветах і ваяводствах ВКЛ, дзе і ездзілі на соймікі. Акрамя таго, былі зразумелы прычыны па якім на сойміке не было магнатаў Паўла Сангушкі, Казіміра і Міхала Чартарыйскіх. Не цікавіліся соймікамі падчашы ВКЛ Аляксандр Пацей і рагачоўскі староста Міхал Пацей. Полацкі скарбнік Казімір Жук знаходзіўся ў сваіх уладаннях у Полацкім ваяводстве і верагодна нічога ня ведаў аб сойміку. А дзе знаходзіўся віцебскі ваявода Марцін Агінскі не было вядома. Усе іншыя шляхціцы па запэўніваннях Быкоўскага і Русецкага прыбылі на соймік і прысягнулі Аўгусту ІІІ [11, л. 22–22об].

Значная колькасць прыхільнікаў Аўгуста ІІІ на чале з мсціслаўскім гродскім старостай Аляксандрам Валовічам знаходзілася ў Мсціслаўскім ваяводстве. Аднак гэта ваяводства было адзелена ад расійскіх войскаў, якія знаходзіліся ў Віцебску і Быхаве, атрадамі прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага ў Аршанскім павеце. Ды і ўся шляхта Мсціслаўскага ваяводства падзялілася на два лагеры: прыхільнікаў Станіслава І і Аўгуста ІІІ. 17 снежня 1733 г. лідэр прыхільнікаў Аўгуста ІІІ мсціслаўскі гродскі староста Аляксандр Валовіч звярнуўся да Юрыя Рапніна з просьбай даслаць у дапамогу расійскія войскі супраць прыхільнікаў Ляшчынскага. Гэтыя войскі павінны былі дапамагчы правесці 22 снежня 1733 г. перадкаранацыйны соймік. Рапнін не ведаў Валовіча, але той паведаміў, што мае дакумент аб падтрымкі яго дзеянняў ад расійскага пасла ў Рэчы Паспалітай Карал Густава Левенвольдэ [11, л. 43–44]. Адначасова 20 снежня 1733 г. Аляксандр Валовіч звярнуўся па дапамогу ў Быхаў да расійскага майора Аленіна, дзе таксама быў прадстаўлены вышэйзгаданы дакумент ад Левенвольдэ. Аленін адразу 20 снежня 1733 г. даслаў з Быхава ў Мсціслаў 150 жаўнераў з паручыкам, прапаршчыкам, сяржантам, двума капраламі і барабаншчыкам [9, л. 30об–31]. Праўда, па невядомым прычыным, сам соймік адбыўся пазней, толькі 11 студзеня 1734 г., і на ім была створана канфедэрацыя Мсціслаўскага ваяводства, а яе маршалкам быў абраны Аляксандр Валовіч. Выбар паслоў на каранацыйны сойм быў адкладзены на больш позні час. На гэтым сойміку шляхта прасіла Валовіча застацца ў Мсціслаўлі, каб рассылаць універсалы з заклікам прызнаць уладу Аўгуста ІІІ і далучыцца да канфедэрацыі яго прыхільнікаў [12, р. 84–84v, 85–86v]. Становішча прыхільнікаў Аўгуста ІІІ у Мсціслаўскім ваяводстве, аднак, заставалася небяспечным з-за знаходжання ў ваяводстве значнай колькасці прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага. Менавіта таму ў студзені 1734 г. Валовіч звярнуўся за дапамогай да смаленскага віцэ-губернатара Сямёна Казлоўскага з просьбай даслаць расійскіх жаўнераў для абароны [13, с. 22]. Асцярогі Валовіча былі выкліканы тым,

што ў Мсціслаўскае ваяводства з элекцыйнага сойма вярнуліся яго праціўнікі і прыхільнікі Ляшчынскага. Яны прывезлі канстытуцыю сойма, а таксама ўніверсалы Станіслава І, якія склікалі паспалітае рушанне. Менавіта таму для дапамогі Валовічу ў правядзенні грамнічнага сойміка Юрый Рапнін даслаў атрад капітана Таўстога. Грамнічны соймік скончыўся паспяхова, і на ім былі абраны паслы на каранацыю Аўгуста ІІІ [11, л. 22, 56–56об].

Аршанскі гродскі староста Юзафовіч у гэты час размясціўся каля Шклова і 31 снежня 1733 г. пераправіўся праз Днепр і нечаканна атакаваў расійскі атрад, які дыслацыраваўся ў горадзе [11, л. 2–2об]. Пасля гэтага Юзафовіч на чале шасці харугваў прыхільнікаў Ляшчынскага колькасцю 600 жаўнераў размясціўся каля Бялыніч. Да яго далучаліся ўсё новыя і новыя прыхільнікі Ляшчынскага: «прибавляютца де еще болше» [11, л. 14]. Для лепшай разведкі дыслакацыі атрадаў прыхільнікаў Ляшчынскага ў пачатку студзеня 1734 г. Рапніным у Шклоў быў пасланы атрад секунд-майора Мальгунова. У Копысь ён прыбыў 4 студзеня 1734 г. і накіраваўся ў Шклоў, бо меў інфармацыю аб знаходжанні тут у прадмесці атрадаў прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага. У Шклоў атрад Мельгунова прыбыў 9 студзеня 1734 г., але прыхільнікаў Ляшчынскага ўжо тут не заспеў, бо яны перамясціліся ў Галоўчын. Мельгуноў накіраваўся за імі і прыбыў у Галоўчын у восем гадзін вечара 10 студзеня 1734 г. Тут ён знайшоў атрад прыхільнікаў Ляшчынскага «в количестве 120 товарищей» пад кіраўніцтвам ротмістраў Навацкага, Шкультэцкага і Васілеўскага, якія адразу пачалі страляць па расійскаму атраду. У выніку перастрэлкі прыхільнікі Ляшчынскага палічылі за лепшае адступіць з Галоўчына і накіравацца да свайго асноўнага атрада пад кіраўніцтвам Юзафовіча. Мельгуноў меў інфармацыю, што Юзафовіч з сваім атрадам даведаўся аб набліжэнні расійскіх войскаў і адыйшоў з Бялыніч у невядомым накірунку [11, л. 18–19об]. На самой справе Юзафовіч пакінуў межы Аршанскага павета і праз Мінскае ваяводства накіраваўся ў Наваградскае. Такім чынам, на ўсходзе ВКЛ не засталося значных атрадаў прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага.

У канцы 1733 – пачатку 1734 гг. шляхта ўсё больш і больш паветаў ВКЛ стварала канфедэрацыі ў падтрымку Ляшчынскага. Праявіла актыўнасць і шляхта ўсходніх ваяводстваў ВКЛ. Рапнін 14 лютага 1734 г. скардзіўся, што актыўна супраць расійскіх войскаў дзейнічаюць прыхільнікі Ляшчынскага ў Полацкім ваяводстве, Ашмянскім і Аршанскім паветах [11, л. 26]. Як казалася вышэй, аршанская і полацкая шляхта ўжо ў пачатку 1734 г. выступалі на баку Станіслава І Ляшчынскага. Рапнін быў вымушаны даслаць атрад у Аршанскі павет для знішчэння прыхільнікаў Станіслава І і каб вымусіць мясцовую шляхту прысягнуць Аўгусту ІІІ [13, с. 46, 63]. Акрамя таго, гэты атрад меў абараняць мясцовых прыхільнікаў Аўгуста ІІІ падчас грамнічнага сойміка. У выніку ўсё адбылося згодна планам Рапніна: «в Оршанском повете, сего ж января 28 дня (8.02 н.с.), сеймик будет громничный, а во оном повете имеется замешания и многие находятся к российской стороне несклонны и чтоб оные противники Оршанскаго повету шляхетству, в принятии генеральной конфедерации варшавской и в верности Его Королевскому Величеству польскому Августу III в присяге и в подписке не учинили б какого замешания, того ради командировал я капитана одного, солдат и драгун девяносто человек с принадлежащим числом обер и унтер офицеров» [13, с. 46–47]. Гэта прынесла поспех, і 10 лютага 1734 г. Рапнін інфармаваў, што аршанская шляхта колькасцю 204 чалавек на грамнічным сойміку прысягнула Аўгусту ІІІ. Мясцовая шляхта абрала паслоў да Аўгуста ІІІ: аршанскага скарбніка Міхала Катовіча і Адама Кроера, а таксама да расійскай царыцы Ганны Іванаўны – Ларскага і аршанскага мастаўнічага Яна Бародзіча [11, л. 24].

Супакоіла сітуацыю ў Аршанскім павеце і адсутнасць тут атрада Юзафовіча. Адстунасць у Аршанскім павеце прыхільнікаў Ляшчынскага дало магчымасць Рапніну зрабіць паход у Полацкае ваяводства, каб прымусіць мясцовую шляхту прызнаць уладу Аўгуста ІІІ. Гэты паход скончыўся паспяхова, і прыхільнікі Ляшчынскага ў Полацкім ваяводстве капітуліравалі без бою 8 сакавіка 1734 г. пад Туроўляй толькі пры адным з'яўленні расійскіх войскаў. Маршалак полацкай канфедэрацыі прыхільнікаў Ляшчынскага полацкі стольнік Юзаф Пакаш 9 сакавіка 1734 г. заключыў дамову з Рапніным. Гэтая дамова складалася з 3 пунктаў. Згодна з ёй, полацкая шляхта мела аддаць сваю харугву Рапніну (гэта значыць распускалася); полацкая шляхта заяўляла аб тым, што не ваявала супраць расійскіх войскаў і прасіла не прымушаць прынесці прысягу Аўгусту ІІІ; расійскія войскі не рабілі шкодаў уладанням у Полацкім ваяводстве. Большасць шляхты, праўда, не стала ўдзельнічаць у заключэнні дамовы і ў ноч з 8 на 9 сакавіка 1734 г. збегла ў паўднёва-заходнім накірунку. Рапнін пасля заключэння дамовы заняў Полацк, але не Рабіў спробаў правесці соймік, дзе мясцовая шляхта мела прынесці прысягу Аўгусту ІІІ [11, л. 31, 59; 13, с.21, 63; 14, л. 11–12; 19, к. 9–9v].

Яшчэ раней, 3 сакавіка 1734 г., Рапнін даслаў у разведку ў Улу атрад у трыдцаць драгун пад кіраўніцтвам прапаршчыка Булычова. У Бешанковічах гэты атрад нечакана быў атакаваны атрадам у пяцьдзесят чалавек прыхільнікаў Ляшчынскага (напэўна зыйшоўшыя з-пад Туроўлі атрады канфедэрацыі Полацкага ваяводства). Булычоў адбіў іх атаку і перайшоў у контарнаступленне. У гэты час з'явіліся асноўныя сілы прыхільнікаў Ляшчынскага колькасцю пяць харугваў. Гэта прымусіла Булычова зноў вярнуцца ў Бешанковічы і абараняцца ад перавышаючых сілаў праціўніка. Прыхільнікі Ляшчынскага падпалілі Бешанковічы, якія ў выніку згарэлі. Бітва працягвалася з палудня да чатырох гадзін раніцы.

У выніку, Булычоў вымушаны быў адступіць, але і прыхільнікі Ляшчынскага не пераследвалі яго [11, л. 34–34об].

З адыходам Рапніна ў Полацкае ваяводства ў Аршанскім павеце зноў актывізаваліся атрады прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага. Гэтаму садзейнічала вяртанне ў Аршанскі павет атрада пад кіраўніцтвам Аляксандра Юзафовіча. Гэты атрад атрымаў загад генеральнага рэгіментарыя Антонія Паця вярнуцца на ўсход ВКЛ з Наваградскага ваяводства. Ён накіраваўся на ўсход ВКЛ у канцы лютага 1734 г. праз Нягневічы, Налібокі на Мінск, Ракаў у бок Віцебска [16, s. 197]. Дакладным месцам дыслакацыі гэтага атрада стаў Аршанскі павет. 17 сакавіка 1734 г. у Чарэі быў арганізаваны “генеральны кангрэс” Аршанскага павета. На ім было прынята рашэнне аб фарміраванні 6 конных харугваў. Першая – павятовага палкоўніка колькасцю 100 чалавек, а ў астатніх пяці павінна было быць па 80 чалавек. Для іх забеспячэння быў вызначаны падатак у 20 злотых “з кожнага дыма”. Гэтыя харугвы павінны былі сабрацца ў Оршы. У сталіцы павета праз два тыдні мела сабрацца і пяхота [11, л. 94–94об; 17, s. 758–761; 18, k. 597–599]. Напэўна пра гэтыя пяць харугваў якія былі пад кіраўніцтвам Юзафовіча і ротмістраў: Ваўжэцкага, смаленскага падкаморыя Антонія Храпавіцкага, Багуслава Шкультэцкага і Перуція, і ўспамінае Тадэвуш Агінскі. Захавалася кароткае апісанне Агінскага гэтых харугваў: “Людзі былі ўсе добрыя, адважныя, на добрых канях” [19, s. 71]. У самой Оршы таксама размясціліся прыхільнікі Станіслава Ляшчынскага «весма в немалом собрании» і чакалі прыбыцця Юзафовіча з двюма ці трыма тысячамі пяхоты. Яны разграбілі ўладанні прыхільнікаў Аўгуста ІІІ, асабліва шукалі абранага паслом да Ганны Іванаўны аршанскага мастаўнічага Яна Бародзіча. Аднак яго не знайшлі і толькі разграбілі яго дом [11, л. 46–47]. 27 сакавіка 1734 г. Юзафовіч няўдала штурмаваў Горкі, дзе размясціўся расійскі атрад палкоўніка Швыкоўскага. Пад кіраўніцтвам Юзафовіча ў гэты час было 6 ротмістраў са сваімі харугвамі і значаня колькасць шляхты, а сярод іх былі і тыя, якія раней ужо прысягнулі Аўгусту ІІІ [11, л. 56–56об]. Смаленскі віцэ-губернатар Казлоўскі быў вымушаны накіраваць на дапамогу ў Горкі з Вяцкага батальёна дзве роты і 50 чалавек «польского корпуса» [13, с. 124, 132].

Узмацненню руху прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага на ўсходзе ВКЛ садзейнічала і з’яўленне тут атрада пад кіраўніцтвам перавальскага старосты Тадэвуша Агінскага. Да атрада Агінскага далучыліся 2 харугвы рэгулярнага войска і выпраўныя харугвы прыхільнікаў Ляшчынскага (хутчэй усяго з Браслаўскага павета). У Бешанковічах Агінскі сустрэўся з канфедэрацыяй Полацкага ваяводства пад кіраўніцтвам Юзафа Пакаша. У сярэдзіне сакавіка 1734 г. Агінскі размясціўся ў Круглым і ўстанавіў кантакт з атрадам аршанскай шляхты пад кіраўніцтвам Аляксандра Юзафовіча, які складаўся з пяці харугваў, які знаходзіўся недалёка, ў Цяцерыне. У Круглым атрад Агінскага быў атакаваны атрадам Адама Кроера, які складаўся з 100 кавалерыстаў і 600 расійскіх пехацінцаў. Агінскі разбурыў мост і адступіў праз раку Друць. На дапамогу яму падыйшлі атрады аршанскай шляхты і дапамаглі адбіць наступленне атрада Кроера. Колькасная перавага была на баку Кроера, і Агінскі палічыў за лепшае адступіць і праз Паўловічы і Бобр накіраваўся да Глыбокага [6, 359–360; 19, s. 71].

З’явілася праблема ў прыхільнікаў Аўгуста ІІІ у Мсціслаўскім ваяводстве. Прыхільнікі Аўгуста Ляшчынскага ў гэтым ваяводстве сабраліся ў атрад у Бабылічах. Па просьбе Валовіча з Быхава 16 сакавіка 1734 г. капітан Кураш даслаў атрад паручыка Таўстога з 50 жаўнерамі. З’яўленне расійскіх войскаў прымусіла прыхільнікаў Ляшчынскага выратоўвацца ўцёкамі і фактычна ўсё Мсціслаўскае ваяводства аказалася пад кантролем Аляксандра Валовіча і яго прыхільнікаў [11, л. 138–139об]. Гэта дало магчымасць самому Валовічу разам з мсціслаўскім абозным Маркам Жыркевічам накіравацца ў Пецярбург як абраны пасол ад Мсціслаўскага ваяводства да царыцы Ганны Іванаўны [13, с. 65].

Актыўнасць прыхільнікаў Ляшчынскага вымусіла Рапніна 23 сакавіка 1734 г. зноў накіравацца ў Аршанскі павет. Гэта рашэнне Рапніна было падтрымана расійскай царыцай Ганнай Іванаўнай, але яна патрабавала, каб ён пакінуў гарнізон у Віцебску для абароны ваяводства ад прыхільнікаў Станіслава Ляшчынскага. Яшчэ раней у Горкі Рапніным быў дасланы атрад пад кіраўніцтвам секунд-майора Пуцяціна. Паход галоўнага корпуса Рапніна скончыўся паспяхова. Прыхільнікі Станіслава І Ляшчынскага атступалі пры набліжэнні расійскіх войскаў. У нешматлікіх сутычках перамога заставалася за расійскімі войскамі, і падчас адной з іх у палон трапіў ротмістр Ласкарыс. У прысутнасці расійскіх войскаў шляхта зноў прынесла прысягу Аўгусту ІІІ. Атрад Юзафовіча быў вымушаны адступіць з Оршы і накіраваўся да Быхава. Атрад прэм’ер-майора Аленіна, які там знаходзіўся, не быў здольны супрацьстаяць Юзафовічу і прасіў дапамогі ў Рапніна. Праўда Юзафовіч таксама не рашыўся штурмаваць Быхаў і адступіў пры набліжэнні асноўных сілаў Рапніна [11, л. 56об; 13, с.115, 117, 122].

У Пецярбурзе былі занепакоены актыўнасцю прыхільнікаў Ляшчынскага на ўсходзе ВКЛ. Згодна загаду Ганны Іванаўны ад 15 красавіка 1734 г., корпус Рапніна павінен быў іх знішчыць і прымусіць мясцовую шляхту прызнаць каралём Аўгуста ІІІ. Ганна Іванаўна загадала для «разогнания» атрадаў Юзафовіча даслаць войскі ў Оршу «и к Горкам и в протчие места немедленно». Рапнін 17 красавіка 1734 г. накіраваў атрад майора Арлова ў Оршу, Шклоў, Горкі «и в прочие места» [13, с. 142; 14, л. 35–36]. Садзейнічала рашучасці Рапніна чарговае павелічэнне яго корпуса за кошт прыбыцця жаўнераў з Смален-

ска. Гэта дало магчымасць размясціць сваі гарнізоны ў Оршы, Шклове, Горках і іншых гарадах, і такім чынам узяць пад кантроль сітуацыю ў Аршанскім павеце і Мсціслаўскім ваяводстве. Пасля размяшчэння сваіх гарнізонаў у гэтых гарадах, Рапнін заняўся знішчэннем атрадаў прыхільнікаў Ляшчынскага. Па падліках Тадэвуша Агінскага, корпус Рапніна складаўся прыкладна з 3 тысяч жаўнераў. Дапамагалі яму атрады прыхільнікаў Аўгуста III Ларскага і Адама Кроера. Апошні з іх меў 100 кавалерыстаў і каля 600 расійскіх пехацінцаў (магчыма 500) пад кіраўніцтвам капітана Менгдэна [13, с. 122; 20, s. 71]. Прычым атрад Кроера прыбыў на дапамогу ад наваградскага ваяводы Мікалая Фаўсціна Радзівіла толькі ў канцы сакавіка 1734 г. [13, с. 103]. Згодна рапарту Рапніна, на 5 мая 1734 г. у яго корпусе ў Аршанскім павеце было 3728 чалавек [11, л. 68–69]. Частка гэтых сіл, праўда, выкарыстоўвалася толькі як гарнізоны ў гарадах на ўсходзе ВКЛ, і таму Рапнін патрабаваў прысланць новых жаўнераў, а затрымка ў іх прыбыцці прывяла да таго, што ў «разогнании и сокращении противничьих партий учинилась немалая остановка» [11, л. 61–62об; 13, с.124, 139, 142–143].

У канцы красавіка 1734 г. Рапнін зрабіў удалы паход у Полацкае ваяводства. Пасля гэтага Рапнін заняўся пераследам асноўных сіл прыхільнікаў Ляшчынскага на ўсходзе ВКЛ. Ужо 26 мая 1734 г., згодна новаму загаду, Рапнін накіраваўся ў Оршу «и протчие места куда потребно будет для скорейшаго разорения и усмирения противников». Праўда ў Віцебску пакідалася 530 жаўнераў «с принадлежащим числом офицеров» [11, л.77]. Дасланыя раней уперад атрады секунд-майораў Арлова і Пуцяціна яшчэ 6 мая 1734 г. у Круглым сутыкнуліся з прыхільнікамі Ляшчынскага пад кіраўніцтвам Тадэвуша Агінскага, які быў дасланы на ўсход ВКЛ генеральным рэгіментарыям ВКЛ Антоніям Пацеям для збірання падаткаў. У выніку кароткай сутычкі атрад Агінскага разбурыў мост і адступіў праз раку Друць. Пуцяцін і Арлоў хацелі пераследаваць яго і пераправіцца праз Друць, але да Агінскага на дапамогу падыйшоў атрад аршанскай шляхты пад кіраўніцтвам аршанскага гродскага старосты Юзафовіча. Гэтыя аб’яднаныя сілы перашкодзілі пераправе расійскіх войскаў. Праўда у выніку бітвы прыхільнікі Ляшчынскага палічылі за лепшае адступіць, але і расійскія войскі не маглі іх пераследваць. Падчас бітвы загінула восем жаўнераў Юзафовіча, 2 патрапіла ў палон, а ў расійскіх войскаў загінуў толькі адзін жаўнер вяцкага палка [11, л. 70–70об]. Юзафовіч адступіў да Барысава, дзе ўжо 10 чэрвеня 1734 г. размясціўся абозам. Тым часам 4 чэрвеня 1734 г. Рапнін са сваім корпусам прыбыў у Оршу. Атрады прыхільнікаў Ляшчынскага, толькі пачуўшы аб набліжэнні корпуса Рапніна, адступілі. Нягледзячы на імкненне Рапніна даць генеральную бітву, прыхільнікі Ляшчынскага паспявалі адыходзіць і хаваліся ад расійскіх войскаў. Адразу пасля з’яўлення Рапніна ў Оршы да яго прыбыла значная колькасць шляхты, якая прысягнула Аўгусту III [11, л. 80]. На 16 чэрвеня 1734 г. быў склікаyны соймік Аршанскага павета, дзе шляхта мела прынесці прысягу Аўгусту III. Нягледзячы на пагрозу аршанскага гродскага старосты Аляксандра Юзафовіча прыхільнікі Аўгусту III сабраліся на соймік і прынеслі прысягу, а таксама абралі сваімі пасламі да расійскай царыцы Ганны Іванаўны Адама Кроера і Яна Бородзіча [11, л. 93; 13, с. 382].

Рапнін меў мэтай знішчыць атрад Юзафовіча. Менавіта таму, калі Рапнін атрымаў інфармацыю аб знаходжанні атрада Юзафовіча ў лагеры ў Лукомле, то 18 ліпеня 1734 г. выступіў супраць яго з Оршы. Юзафовіч даведаўшыся аб прыходзе атрада Рапніна ў Чарэю (якая знаходзіцца недалёка ад Лукомлі), пакінуў свой лагер і перадыслацыраваўся ў Лепель. Рапнін пераследваў яго. Юзафовіч, калі атрымаў звесткі аб руху Рапніна, пакінуў Лепель і перайшоўшы раку Беразіну ўвайшоў у Мінскае ваяводства, дзе і спыніўся. 26 ліпеня 1734 г. на рацэ Беразе секунд-майор Пуцяцін з адной кавалерыяй атакаваў Юзафовіча і перашкодзіў разбурыць мост. Юзафовіч адступіў у мястэчка Панскі ям, дзе контратакаваў значна саступаючыя колькасна яму сілы Пуцяціна і змусіў таго адступіць на іншы бераг ракі. Аднак тут падыйшлі пяхота Пуцяціна і асноўныя сілы расійскага корпуса Рапніна. Яны атакавалі атрад Юзафовіча і прымусілі яго выратоўвацца ўцёкамі. Збегшы ад расійскіх войскаў, астаткі атрада Юзафовіча размясціліся на захадзе Аршанскага павета ў Смалянах. Супраць іх Рапнін выслаў атрад секунд-майора Арлова, што прымусіла Юзафовіча да далейшага адступлення на захад [11, л. 70–70об, 106–107об; 21, л. 1–1об].

Астаткі атрада Юзафовіча пакінулі Аршанскі павет, і ўсход ВКЛ цалкам аказаўся пад кантролем корпуса Рапніна. Выканаўшы загад, корпус Рапніна некаторы час бяздзейнічаў. Новы паход Рапнін прадпрыняў толькі ў канцы верасня 1734 г., калі рушыў у Полацкае ваяводства, каб прымусіць мясцовую шляхту прынесці прысягу Аўгусту III [13, с. 337, 397; 22, л. 3–6об]. Рапнін звярнуўся да полацкага харужага Аляксандра Корсака Бабыніцкага, полацкага падсудка Ісафата Антонія Сялявы і полацкага земскага пісара Базыля Рыпіньскага, каб яны склікалі соймік Полацкага ваяводства для прысягі Аўгуста III. Полацкая шляхта асабліва не супраціўлялася і не хацела далей падтрымліваць Станіслава I Ляшчынскага. У выніку соймік быў скліканы ўніверсаламі полацкага харужага Аляксандра Канстанціна Корсака Бабыніцкага [11, л. 171; 21, л. 17–17об; 23, с. 132]. Сам соймік адбыўся 2 снежня 1734 г. На ім мясцовая шляхта прынесла прысягу і абрала паслоў да Аўгуста III і расійскай царыцы Ганны Іванаўны: інфлянцкага войскага Людвіка Шантыра і інфлянцкага скарбніка Яна Гізберта Студніцкага [10, арк. 22 –23; 23, с. 132].

У гэты час пагоршылася становішча прыхільнікаў Аўгуста III у Мсціслаўскім ваяводстве, і яны звярнуліся да смаленскага віцэ-губернатара Казлоўскага з просьбай даслаць некалькі соцен расійскіх

жаўнераў з пушкамі супраць прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага [13, с. 132]. Адначасова нявельмі дапамагаў мсціслаўскай шляхце ахоўны ліст Ганны Іванаўны ад нападзенняў смаленскай шляхты і збораў правіянта расійскімі войскамі. Асабліва вялікую шкоду нарабіў атрад, які падчыняўся прэм'ер-майору Аленіну, які знаходзіўся ў Быхаве. Гэты атрад збіраў правіянт у прыхільнікаў Аўгуста ІІІ. Мсціслаўская шляхта прасіла кампенсіраваць матэрыяльныя страты. Для рашэння гэтых праблемаў 20 лістапада 1734 г. на мсціслаўскім сойміке быў абраны пасол да смаленскага віцэ-губернатара Фёдара Шэпелева і Юрыя Рапніна: мсціслаўскі падстароста і ўгіскі староста Крыштаф Валовіч. Акрамя таго, быў дасланы пасол Юрый Тамашэвіч да Аленіна з просьбай не збіраць падаткі ў Мсціслаўскім ваяводстве згодна ахоўнага ліста расійскай царыцы [24, арк. 38–39адв; 40–41адв, 44–47].

Яшчэ адной праблемай для расійскага ўрада сталі абраныя на аршанскім сойміку паслы да Ганны Іванаўны: Адам Кроер і аршанскі мастаўнічы Ян Барадзіч. Адам Кроер са сваім атрадам вызначыўся шматлікімі грабяжамі пад выглядам збірання правіянта. Асабліва шмат шкодаў ён нарабіў уладанням рускага ваяводы Аўгуста Чартарыйскага. Яшчэ горш было простай шляхце, а асабліва Шэмешу, які раней судзіўся з Кроерам. У выніку супраць злоўжыванняў Кроера выступілі нават прыхільнікі Аўгуста ІІІ: навагрудскі ваявода Мікалай Фаўсцін Радзівіл і мечнік ВКЛ Ігнат Завіша, які, як пасол у Расію, зрабіў адпаведнае прадстаўленне расійскаму ўраду. Завіша сцвярджаў, што Кроер і паслом фактычна абраў сам сябе, і пад пагрозай зброі прымусіў пагадзіцца аршанскую шляхту, якая прысутнічала на сойміку. Акрамя таго, устанавіў завышанныя выплаты паслам да Ганны Іванаўны і Аўгуста ІІІ «по четыре гульдена с дыму». Пасля гэтага з дапамогай свайго атрада пачаў збіраць гэтыя падаткі, рабуючы шляхецкія ўладанні і нават забівая нязгодную шляхту. У чэрвені 1734 г., па загаду генерала Льва Ізмайлава, Кроер за свае дзеянні быў арыштаваны разам са сваёй харугвай. Кроер патрабаваў свайго вызвалення, як нявінаватага, і 20 чэрвеня 1734 г. з Оршы нават накіраваў “челобитную” да расійскай царыцы Ганны Іванаўны. У ёй падкрэсліваў свае баявыя заслугі, што яго абгаварылі, а ён не рабіў ніякіх парушэнняў закона. Асабліва Кроер падкрэсліваў, што з-за арышту ня можа з пасольствам паехаць у Пецярбург, як абраны аршанскім паслом. Яго звароты да Мікалая Фаўсціна Радзівіла і ў Расію мелі поспехі, і ўжо ў жніўні 1734 г. па загаду Ізмайлава Кроер быў выпушчаны з-пад арышту. Расійскі ўрад на падставе звароту Кроера, Барадзіча і Завішы прыняў хітрае рашэнне. Паабяцаўшы Кроеру і Барадзічу сваю дапамогу, расійскі ўрад інфармаваў Рапніна аб ім, але паведаміў, што яго не трэба выконваць і ўвогуле старацца дыстанцыравацца ад канфлікта Кроера з ураднікамі ВКЛ. Адначасова Рапнін меў даведацца аб гэтым канфлікце як мага больш [11, л. 97–97об; 13, с. 264, 337; 14, л. 66–68, 71, 110об, 114–115, 123–131, 133–140, 142–155, 161–162]. Падтрымка, зробленая на словах расійскім урадам, акрыліла Кроера, які, вярнуўшыся ў ВКЛ, зноў пачаў грабіць шляхецкія ўладанні. Больш таго, падрабіў пячатку Мікалая Фаўсціна Радзівіла і выдаваў за яго ўказы. Гэта стала вядома і ў Пецярбургу, і царыца Ганна Іванаўна 6 лютага 1735 г. прыказала Кроеру: «нетокмо никакой протекции на давали, но и до самовольных поступок его не допускали». Акрамя таго, расійская царыца патрабавала ў выпадку парушэння законаў Кроера звязацца з Мікалаем Фаўсцінам Радзівілам для ўзгаднення сумеснага рашэння [25, с. 25].

Сітуацыя на ўсходзе ВКЛ зноў абвастрылася ў сувязі з рухам сюды ў канцы 1734 г. атрада прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага пад кіраўніцтвам Тадэвуша Агінскага, які складаўся з 20 драгунскіх, 6 пяцігорскіх, авангардных і павятовых харугваў [25, с .47]. Садзейнічала гэтаму і то, што Рапнін з большай часткай свайго корпуса зыйшоў з усхода ВКЛ і накіраваўся ў Ашмянскі павет, каб супакоіць мясцовых прыхільнікаў Ляшчынскага [21, л. 22]. Атрад Агінскага спачатку рушыў у Аршанскі павет, дзе захапіў Шклоў і спыніўся там на тры тыдні. Далей Агінскі накіраваўся ў Мсціслаўскае ваяводства, у Крычаўскае староства. Па дарозе авангардная харугва ротмістра Узлоўскага была разбіта атрадам войска ВКЛ пад кіраўніцтвам Яна Косці і Бляўскага, якія дыслацыраваліся ў Магілёве. Для помсты Агінскі прадпрыняў спробу захапіць Магілёў, але яна скончылася няўдачай. Пасля гэтага Агінскі разграбіў Чавусы і зноў накіраваўся ў Крычаўскае староства. У наказанне за супраціўленне атрад Агінскага разграбіў Крычаў. У гэтым горадзе атрад Агінскага затрымаўся на чатыры тыдні [1, с. 104; 19, s. 76; 25, с. 47–48]. Доўгае знаходжанне атрада Агінскага ў Мсіцслаўскім ваяводстве садзейнічала стварэнню мясцовай канфедэрацыі прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага. Тым больш, што адпаведныя ўніверсалы даслалі да мсціслаўскай шляхты Антоній Пацей (ад 3 лютага 1735 г.) і Тадэвуш Агінскі (ад 15 сакавіка 1735 г.) [26, арк. 175–176адв, 186–187]. Прыхільнікі Ляшчынскага стварылі канфедэрацыі ў яго падтрымку і нават арганізавалі дывізію пад кіраўніцтвам мсціслаўскага лоўчага і мсціслаўскага падстаросты Антонія Парчэўскага. Яны спрабавалі аб'яднацца з атрадам Тадэвуша Агінскага, але расійскія войскі (згодна завышанай інфармацыі ў 4000 жаўнераў) пад кіраўніцтвам Кураша ў Гумнах разграмілі іх [26, арк. 214–215адв, 216–216адв; 27, s. 397]. З гэтага часу Мсціслаўскае ваяводства зноў аказваецца пад кантролем прыхільнікаў Аўгуста ІІІ. Агінскі, калі даведаўся аб руху да яго моцнага атрада Мікалая Фаўстына Радзівіла, то ў красавіку 1735 г. пачаў адступаць да Шклова. Агінскі меў памылковую іфнармацыі аб нязначнасці расійскага гарнізона ў Оршы (усяго 200 чалавек, з якіх толькі 100 здаровых). Па гэтай прычыне прадпрыняў няўдалую спробу захопа Оршы. Насамрэч гарнізон пад кіраўніцтвам вахмістра Ра-

гаўцова складаўся з 700 жаўнераў, якія адбілі нападзенне. Агінскі адступіў да Смалянаў, дзе прабыўшы пяць дзён, накіраваўся да Глыбокага і пакінуў усход ВКЛ [6, с. 369].

**Заключэнне**. Ва ўсходніх ваяводствах ВКЛ размясціўся корпус расійскіх войскаў пад кіраўніцтвам палкоўніка Юрыя Рапніна. Яго колькасць з часам толькі ўзрастала. Пастаянным месцам дыслакацыі гэтага корпуса быў абраны Віцебск. Другая частка корпуса размясцілася ў Быхаве. Мэтай Рапніна было перашкодзіць дзеянням прыхільнікаў Ляшчынскага на ўсходзе ВКЛ і арганізоўваць прысягу мясцовай шляхты Аўгусту ІІІ. Сітуацыя ва ўсходніх паветах мела свае адрозненні. У Віцебскім ваяводстве шляхта адразу прызнала Аўгуста ІІІ і не рабіла ніякіх дзеянняў у падтрымку Станіслава І Ляшчынскага. Гэта было выклікана пастаяннай дыслакацыяй у Віцебску корпуса Рапніна. Ужо 25 студзеня 1734 г. на сваім сойміку віцебская шляхта прысягнула Аўгусту ІІІ. У Мсціслаўскім ваяводстве прыхільнікі Аўгуста ІІІ пад кіраўніцтвам Валовіча атрымалі перавагу над прыхільнікамі Ляшчынскага толькі дзякуючы падтрымкі дасланых атрадаў расійскіх войскаў. Хаця ініцыятыва ў арганізацыі канфедэрацыі прыхільнікаў Аўгуста ІІІ зыходзіла ад мясцовай шляхты, і яна яе стварыла на сваім сойміку яшчэ 11 студзеня 1734 г. Адначасова расійскія атрады былі вымушаны ўвесь час іх абараняць ад атрадаў прыхільнікаў Ляшчынскага ў Мсціслаўскім ваяводстве. Нягледзячы на ахоўны ліст ад царыцы Ганны Іванаўны, прыхільнікі Аўгуста ІІІ у Мсціслаўскім ваяводстве ўвесь час сутыкаліся з праблемай збору правіянта расійскімі войскамі. Шляхта Аршанскага павета і Полацкага ваяводства ў сваёй большасці выступіла на баку Станіслава Ляшчынскага. Прычым некаторая частка аршанскай шляхты пад прымусам прысутных расійскіх войскаў прызнала каралём Аўгуста ІІІ і прысягнула яму яшчэ падчас грамнічнага сойміка 8 лютага 1734 г. Аднак у сваёй большасці аршанская шляхта выступіла на баку Станіслава І Ляшчынскага і сфарміравала ўзброеныя харугвы ў яго падтрымку пад кіраўніцтвам мясцовага гродскага старосты Аляксандра Юзафовіча. Менавіта супраць іх і праводзіў асноўныя баявыя дзеянні корпус Рапніна. Гэтыя баявыя дзеянні ў асноўным выглядалі як шматлікія дробныя сутычкі. Такі від вайны быў больш карысным для прыхільнікаў Ляшчынскага, якія не маглі ў баю супрацьстаяць рэгулярным расійскім войскам. Пад кантроль стуацыю ў Аршанскім павеце Рапніну ўдалося ўзяць толькі пасля перамогі расійскіх войскаў над атрадам Юзафовіча 26 ліпеня 1734 г. на рацэ Беразе. Шляхта Полацкага ваяводства таксама выказалася на баку Станіслава І Ляшчынскага, але дзейнічала меньш актыўна, чам аршанская. Рапнін двойчы рабіў паходы ў Полацкае ваяводства. У выніку першага з іх, полацкая шляхта 8–9 сакавіка 1734 г. капітуліравала без бою пад Туроўляй, а потым у сваёй большасці збегла з месца перамоваў. Падчас другога пахода Рапнін прымусіў полацкую шляхту 2 снежня 1734 г. на сваім сойміку прызнаць уладу Аўгуста ІІІ. Двойчы прыхільнікі Ляшчынскага атрымлівалі дапамогу ў выглядзе паходаў атрада пад кіраўніцтвам Тадэвуша Агінскага, што актывізіравала іх выступленні ва ўсходніх ваяводствах ВКЛ. Канчаткова Рапніну ўдалося супакоіць сітуацыю на ўсходзе ВКЛ толькі ў пачатку 1735 г.

ЛІТАРАТУРА


1. Бутурлин, Д. Военная история походов россиян в XVIII столетии / Д. Бутурлин. – СПб, 1823. –Т 3, ч. 1. – 411 с.
2. Sliesoriūnas, F. Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė 1733 – 1736 metų tarpuvaldžiu / F. Sliesoriūnas // Lietuvos Valstybė XII – XVIII a. – Vilnius, 1997. – S. 365–381.
3. Sliesoriūnas, F. Mūšis prie Vilniaus ir miesto nusiaubimas 1734 metais / F. Sliesoriūnas // Lietuva ir jos kaimynai: nuo Normanų iki Napoleono. Prof. Broniaus Dundulio atminimui. – Vilnius, 2001. – P. 311–329.
4. Мацук, А. Войска як інструмент усталявання ўлады Аўгуста III у ВКЛ у 1733–1735 г. / А. Мацук // Беларускі гістарычны агляд, 2008. – Т.15, сшыткі 1-2 (28–29). – С. 329–364.
5. Цясельскі, Т. Узброенныя сілы ВКЛ падчас вайны за польскую спадчыну ў 1733–1735 гг. / Т. Цясельскі // Архэ. – 2011. – № 6. – С. 246–259.
6. Цясельскі, Т. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага падчас вайны за польскую спадчыну ў 1733–1735 гг. / Т. Цясельскі // Архэ. – 2012. – № 6. – С. 347–371.
7. Мацук, А. Значение боевых действий в ВКЛ в войне за “польское наследство” / А. Мацук // Война и оружие. Новые исследования и материалы : тр. Четвертой междунар. науч.-практ. конф., Санкт-Петербург. – Ч. III. – С. 198–218.
8. Сборник Русского исторического общества / собр. и изд. под ред. А. Н. Филиппова. – СПб, 1899. – Т. 106 : Бумаги Кабинета Министров Императрицы Анны Иоанновны. – Ч. 2. Год 1733. – 654 с.
9. Российский государственный архив древних актов. – Ф. 177. Д. 7.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1734. Воп. 1. Спр. 24.
11. Российский государственный архив древних актов. – Ф. 177. Д. 18.
12. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka. – F.148. B.80.
13. Сборник Русского исторического общества / собр. и изд. под ред. А. Н. Филиппова. – СПб, 1900. – Т. 108 : Бумаги Кабинета Министров Императрицы Анны Иоанновны. – Ч. 3. Год 1734. – 512 с.
14. Архив внешней политики Российской империи. – Ф.79. Оп.1. Д. 45а.
15. Biblioteka PAN i PAU. – Sygn. 1175.

16. Codzienne kłopoty, wielkie interesy i podwójna elekcja : korespondencja radziwiłłowskich urzędników z księżną Anną z Sanguszków Radziwiłłową i jej synem Michałem Kazimierzem z 1733/1734 roku / wydał J. Dygdała. – Warszawa, 2013. – 226 s.
17. Biblioteka Ossolińskich. – Sygn. 6611.
18. Archiwum Główne Akt Dawnych. Zbiór Komierowskich. – Sygn. 62/82.
19. Pamiętnik Tadeusza Ogińskiego // Przegląd historyczny. – 1914. – Z. 1. – 51 – 83.
20. Matuszewicz M., Diariusz życia mego / M. Matuszewicz. –Warszawa, 1996. – T.1. – 928 s.
21. Российский государственный военно-исторический архив. – Ф.20. Оп.1. Д. 54. – Ч. 1.
22. Архив внешней политики Российской империи. – Ф.79. Оп.1. Д. 45б.
23. Мацук, А. Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, соймікі / А. Мацук. – Мінск, 2014. – 233 с.
24. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1729. Воп. 1. Спр. 38а.
25. Сборник Русского исторического общества / собр. и изд. под ред. А. Н. Филиппова. – Юрьев, 1901. – Т. 111 : Бумаги Кабинета Министров Императрицы Анны Иоанновны. – Ч. 4. Год 1735. – 587 с.
26. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 1729. Воп. 1. Спр. 39.
27. Dyariusz życia Ignacego Łopacińskiego // Biblioteka Warszawska. – 1855. – T. 3. – S. 393–425.

*Паступіў 12.11.2015*

## THE GENTRY OF EASTERN PROVINCES OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AND RUSSIAN TROOPS DURING "WAR OF THE POLISH SUCCESSION IN1733-1735"

***A. MATSUK***

*In the article the relationships between the gentry of eastern provinces of the grand Duchy of Lithuania (Orsha district, Vitebsk, Polotsk and Mstislav provinces) and russian forces, which had been introduced in order to fight with supporters of Stanislaw I Leszczynski and to support local followers of August III are sudied. It is noticed that on the side of Stanislaw I Leszczynski was the gentry of Orsha district and Polotsk province. Against them were sent the Russian troops from the corp of Yuri Repnin. It was found that with the support of russian troops in advantage in Mstislavl province also received followers of August III. It was established that the victory of russian troops over the supporters of Polotsk province Leszczynski and Orsha district, forced the local gentry at the end of 1734 recognized the authority of August III.*

***Keywords**: gentry, russian troops, the corp if Yu. Rapnin, Stanislaw I Leszczynski, August III.*